Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

ЛЯВОНІХА

(НА НАРОДНЫ МАТЫЎ)

Эх, Лявоніха, якая-ж ты цяпер!
Не пазнаць цябе, Лявоніха,
павер,—
Буйна-буйна тваё шчасце
зацвіло,
Як-бы й долі ў цябе горкай
не было.
Завяла ты для сябе калгасны
лад,
І цвіце ён, як цудоўны
любы сад.
Стала жыць табе ўжо лепш
і весялей
Ды пашло ў цябе ўсё так,
як у людзей:
Стаў стаханаўцам заможным
твой Лявон—
Закупіў табе шмат кніг
і патэфон,
Ты-ж адзета ў розных колераў
шаўкі,
Славіш песняй свае новыя
дзянькі.
А трымала ад дзяржавы ты свае
Канстытуцыю, якая табе ўсе
Забяспечвае правы на ўвесь
твой век—
Ці-ж мог мець яе ранейшы
чалавек!
І сягоння ў нас празмерна
кожны рад,
Што па ёй ты ўжо абрала
свой урад,
Бо ў совеце ёсць наш слаўны
дэпутат—
Ён так блізкі, ён так родны
нам усім,—
Гэта лепшы вучань Сталіна—
наш Клім.
Эх, Лявоніха, якая-ж ты цяпер!
Не пазнаць цябе, Лявоніха,
павер,—
У прыгожую святліцу кожны
дзень
Заглядае светла-сонечны
прамень,
Расплываецца наўкруг яго
святло,
Як-бы й хаткі ў цябе курнай
не было.
У святліцы на стале ляжыць
пірог,
Масла, сала, мёд, варэнне
і тварог.
Ты паклікала за стол к свайму
дабру
Катэрыну—сінявокую сястру—
І ад радаснай сустрэчы
ў гэты час
Вы, абняўшыся, пашлі ў вясёлы
пляс:

Эх, сястрыца, Катэрына,
Сінявокая Украіна,
Патанцуем, пагуляем,
Мы на шчасце права маем.
Не пакінем мы на полі
Незасеяных прагалін,
Бо прывёў нас к светлай долі
Наш любімы родны Сталін.
Больш не прыдзе ў нашы хаты
Лёс, адвечнасцю праклятый.
Мы зрадніліся з табою
І з вялікаю Масквою.
Стаў нам родным армянін,
Кабардзінец і грузін...
Ды не толькі мы з табою
Сталі кроўнаю раднёю—
Адзінаццаць нас усіх,
Блізкіх, родных, дарагіх,
Моцных, статных, смелых,
мужных
У такой сястрынай дружбе.

Станцавала Лявоніха гапака
Ды размову аб жыцці зноў
павяла,
Расказала яна украінскай
сястры,
Што ўжо явай сталі мары
яе й сны,
Што усе дужымі жывуць
яе сыны,
Песні звонкія пра Сталіна
пяюць
І рэспубліку да новых зор
вядуць.
Рвецца радасць на прастор
з тваіх грудзей,
Што займела яшчэ больш сабе
дзяцей.
А дзяржава дужа ласкавай
была—
Гадаваць іх табе грошай шмат
дала,
Многа, многа ў цябе рознага
дабра.
Ды няціхая, Лявоніха, пара:
Ходзіць вораг, прытаіўшыся
як гад—
Ён дабру твайму, Лявоніха,
не рад.
Пільна, зорка аглядай ўсё
кругом,
Каб у твой, заліты сонцам
увесь, дом
Не прышла якая пакасць
з воўчых нор
І не зацміла твайго шчасця
ясных зор—
Не здарма-ж ты пралівала
сваю кроў
За Кастрычнік і за маладосць
сыноў.
Ты жывеш у роднай сталінскай
сям'і
Роўнапраўнай гаспадыняю зямлі,
Светлых фабрык, домнаў, шахт
і гарадоў,
Гаспадыняй нашых радасных
гадоў.
Дзякуй Сталіну і партыі
за ўсё—
За прыгожае шчаслівае жыццё,
За расцвіўшыя ў рэспубліцы
сады
І за тое, што ў нас кожны
малады.
Эх, Лявоніха, якая-ж ты цяпер!
Не пазнаць цябе, Лявоніха,
павер,—
Ордэн Леніна ты носіш
на грудзях,
Ой, пашаны табе многа на
людзях.

ТОДАР АЛЕСІН.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. № 1. СТУДЗЕНЬ 1938 г.

На вокладцы: тав. Лёліна Надзежда Сямёнаўна—дэпутат Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР.

3ок-1
1844

Да новых перамог

Радасным лікаваннем, бадзёра і ўпэўнена сустрэў совецкі народ новы тысяча дзевяцьсот трыццаць восьмы год.

Ад края да края, на розных мовах многанацыянальнага і неабсяжнага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пранесліся таварыскія віншаванні: З новым годам, таварышы! З новымі большэвіцкімі поспехамі і дасягненнямі!

Совецкі народ упэўнен у тым, што новы год прынясе з сабою яшчэ большыя радасці, яшчэ большыя поспехі. І таму кожны совецкі грамадзянін, думаючы аб новым годзе, повен жадання працаваць яшчэ лепш на карысць сваёй квітнеючай радзімы.

Прайшоўшы 1937 год быў годам велічэзных гістарычных перамог. Ён навекі застанецца ў памяці народаў СССР, як першы год Сталінскай Канстытуцыі. Пад прамяністай зоркай Сталінскай Канстытуцыі—Канстытуцыі перамогшага соцыялізма, тварыў свае бяссмертныя справы 170-мільённы совецкі народ у мінулым годзе. Кожны з прайшоўшых 365 дзён поўны гераізмам, велізарным энтузіязмам і совецкім патрыятызмам!

Выдатныя прыклады соцыялістычнай працы паказалі стаханаўцы і стаханаўкі прамысловасці, транспарта і соцыялістычных палёў. Яшчэ радасней, яшчэ весялей стала жыццё працоўных. Павялічылася заработная плата, павялічылася стыпендыя навучаючыхся, яшчэ заможней зажыло калгаснае сялянства!

Пушчаны ў строй новы канал Масква-Волга!

На паўночным полюсе ўзняўся чырвоны сцяг Советаў! Адважная чацвёрка зімоўшчыкоў—Папанін, Крэнкель, Шыршоў і Фёдараў пабудавалі там палярную станцыю і вядуць навуковую работу сусветна-гістарычнага значэння.

Сталінскія сокалы, героі Совецкага Саюза—Чкалаў, Байдукоў і Белякоў праклалі паветраную трасу з Масквы ў Амерыку праз Паўночны полюс! За імі новы рэкорд дальняга палёта ўстанавілі тт. Громаў, Юмашэў і Данілін!

На заклік комсамолкі Валі Хетагуравай тысячы совецкіх дзяўчат паехалі на родны Далёкі Усход, каб асвоіць там новыя прадпрыемствы, новыя раёны, каб яшчэ больш умацоўваць абароназдольнасць нашай радзімы.

Пяць адважных дзяўчат Бурат-Манголіі—Маруся Хахлова, Наста Сункуева, Соня Тынева, Ліна Канстанцінава і Вера Любімская прайшлі на лыжах ад Улан-Удэ да Масквы. Гэтым яны даказалі гатоўнасць совецкіх дзяўчат у любы момант стаць на абарону сваёй маці-радзімы.

Колькі радасці, колькі вяселля прынесла сустрэча новага года совецкім жанчынам! На фабрыках, заводах, ва ўстановах і калгасах наладжваліся балы і вечары! Вакол нарадных ёлак весяліліся дзеці, самыя шчаслівыя дзеці ў свеце. Колькі мацярынскай любві і адданасці было ўкладзена ў кожным дзіцячым навагоднім падарунку, у кожнай навагодняй ёлцы! А якой удзячнасцю за шчаслівае дзяцінства гучэлі вясёлыя песні дзяцей аб родным Сталіне, аб нашай цудоўнай краіне!

Самым незабыўным, самым радасным днём мінулага году быў дзень выбараў у Вярхоўны Совет СССР—дзень 12 снежня. У гэты дзень совецкі народ аднадушна галасаваў за партыю Леніна—Сталіна, за непераможны блок комуністаў і беспартыйных. У гэты дзень совецкі народ прадэманстраваў перад усім светам сваё маральнае і палітычнае адзінства, сваю беззаветную адданасць партыі Леніна—Сталіна, яе Цэнтральнаму Камітэту і любімаму правадыру працоўных усяго свету Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну!

Сакрушальны ўдар у мінулым годзе быў нанесен ворагам народу—трацкісцка-бухарынска-рыкаўскім бандытам. Яны хацелі адняць у совецкага народу яго шчаслівае жыццё. Яны хацелі патапіць мільёны людзей у моры крыві. Але ворагі пралічыліся! Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна совецкая разведка, кіруемая сталінскім наркомам тав. Ежовым, апіраючыся на ўзросшую пільнасць усяго народу, знішчыла гэтых подлых наймітаў фашызма—трацкісцка-бухарынскіх шпіёнаў, дыверсантаў і шкоднікаў.

Уступаючы ў новы 1938 год, мы памятаем аб неабходнасці ўсямернага ўзмацнення рэволюцыйнай пільнасці, аб неабходнасці поўнага выкарчавання і знішчэння ворагаў народу.

Новы год будзе годам далейшага бліскучага працвітання нашай радзімы. У 1938 годзе прадукцыя прамысловасці павялічыцца ў параўнанні з 1937 годам на 15,3%, соцыялістычнае земляробства зробіць новы шаг наперад па ажыццяўленню сталінскага наказа—дабіцца ў бліжэйшыя гады збора 7—8 мільярдаў пудоў хлеба ў год.

Калісьці, да рэволюцыі, жанчыны гаданнем і іншымі спосабамі заклікалі пад новы год да сябе шчасце. Але „шчасце" гэта ніколі не прыходзіла ў хаты работніц, у хаты працоўных сялянак, як не прыходзіць яно зараз у хаты працоўных капіталістычных краін. Цяпер совецкай жанчыне няма чаго гадаць! Кожная работніца, калгасніца, інтэлігентка ўпэўнена, што новы год будзе для яе і яе сям'і, як і для ўсёй краіны, годам яшчэ большай заможнасці, яшчэ лепшага шчасця. Яны ў гэтым упэўнены таму, што соцыялізм у нас увайшоў у быт.

„На нашых фабрыках і заводах працуюць без капіталістаў. Кіруюць работай людзі з народу. Гэта і называецца ў нас соцыялізмам на справе. На нашых палях працуюць тружанікі зямлі без памешчыкаў, без кулакоў. Кіруюць работай людзі з народу. Гэта і называецца ў нас соцыялізмам у быту, гэта і называецца ў нас свабодным, соцыялістычным жыццём" (Сталін).

Уступаючы ў новы год, совецкія жанчыны шлюць гарачае прывітанне гераічным народам Іспаніі і Кітая, якія мужна адстойваюць сваю незалежнасць ад фашысцкіх падпальшчыкаў вайны. Мы жадаем ім, нашым сёстрам Іспаніі і Кітая, хутчэйшай і поўнай перамогі над фашысцкімі піратамі!

Сільны і магутны Совецкі Саюз! Няхай аб гэтым памятаюць нашы ворагі. Калі толькі яны пасмеюць напасці на нашу родную совецкую зямлю, яны сустрэнуць адпор не толькі з боку нашай любімай, магутнейшай у свеце Чырвонай Арміі. Яны таксама сустрэнуць дастойны адпор ад усяго совецкага народу і ад гарачых патрыётак сваёй радзімы—совецкіх жанчын!

Инв. 1953 г. БА 66/6 р

Н. Крупская

БРАЦКАЕ САДРУЖАСТВА НАРОДАЎ

Наша партыя з самага пачатку свайго існавання павяла барацьбу за зніштажэнне нацыянальнага гнёту, за сапраўдную роўнасць усіх нацый. Большэвікі разгарнулі сцяг сапраўднага інтэрнацыяналізма.

Нянавісць да ўсякага нацыянальнага прыгнечання, да распальвання нацыянальнай розні чырвонай ніткай праходзіць праз усю дзейнасць Леніна, праз усе творы яго. Гэтае пачуццё ён увабраў, што называецца з малаком маці. У сям'і Владзіміра Ільіча былі жывы слаўныя традыцыі рускага рэволюцыйнага руху. Сярод гэтых традыцый віднае месца займала пачуццё жывейшай сімпатыі да нацый, прыгнечаных царызмам.

Нацыянальнаму пытанню Ленін заўсёды надаваў велізарнае значэнне. Ён з першых крокаў сваёй дзейнасці падкрэсліваў, што барацьба супроць нацыянальнага няроўнапраўя і гнёту— неабходная састаўная частка барацьбы за соцыялізм.

Ужо ў 1894 годзе, у сваёй першай вялікай працы „Што такое „прыяцелі народу“ і як яны ваююць супроць соцыял-дэмакратаў?“, якая адыграла такую буйную ролю ў развіцці нашай партыі, Владзімір Ільіч пісаў: „няма іншага сродку барацьбы з нацыянальнай нянавісцю, як арганізацыя і згуртаванне класа прыгнечаных для барацьбы супроць класа прыгнятальнікаў у кожнай паасобнай краіне, як злучэнне такіх нацыянальных рабочых арганізацый у адну міжнародную рабочую армію для барацьбы супроць міжнароднага капітала“.

Больш 40 гадоў прайшло з таго часу, як былі напісаны гэтыя словы і ўвесь час партыя большэвікоў змагалася супроць распальвання нацыянальнай нянавісці царскім урадам, супроць нацыянальнай адасобленасці, нацыяналізма, які перашкаджаў дружбе народаў, іх ідэйнаму згуртаванню.

У 1903 годзе, у перыяд другога з'езда партыі, Ленін і яго прыхільнікі змагаліся супроць сепаратызма бундаўцаў і паляка ў, якія хацелі захаваць свае асобыя нацыянальныя рабочыя партыі. У артыкуле „Нацыянальнае пытанне ў нашай праграме“, змешчаным тады ў „Искре“, Ленін пісаў: „Праклятая гісторыя самадзяржаўя пакінула нам у спадчыну аграмадную адчужанасць рабочых класаў розных народнасцей, прыгнятаемых гэтым самадзяржаўем. Такая адчужанасць ёсць найвялікшае зло, найвялікшая памеха ў барацьбе з самадзяржаўем...“

З асобай вастрынёй паўстала нацыянальнае пытанне ў 1913 г., калі з аднаго боку, пасля Ленскіх падзей зноў пайшоў на пад'ём рэволюцыйны рух, а з другога, у паветры запахла насоўваючайся імперыялістычнай вайной.

У другой палове лютага 1913 г. Ільіч пісаў Алексею Максімавічу Горкаму: „Наконт нацыяналізма ўпаўне з Вамі згодзен, што трэба гэтым заняцца пасур'езней. У нас адзін цудоўны грузін засеў і піша для „Просвещения“ вялікі артыкул, сабраўшы ўсе аўстрыйскія і інш. матэрыялы. Мы на гэта наляжам“. Тут гутарка ішла аб таварышу Сталіне.

Вялікі артыкул таварыша Сталіна „Марксізм і нацыянальнае пытанне“, напісаны ім у пачатку 1913 г., быў надрукаваны ў № 3—5 большэвіцкага журнала „Просвещение“. Владзімір Ільіч высока ацаніў гэтую работу, не раз спасылаўся на яе ў сваіх дакладах і артыкулах. У гэты-ж перыяд Ленін напісаў у „Правде“ рад артыкулаў па нацыянальнаму пытанню: „Прабуджэнне Азіі“, „Сепаратысты ў Расіі і сепаратысты ў Аўстрыі“, „Рабочы клас і нацыянальнае пытанне“. У гэтым апошнім артыкуле Ільіч пісаў:

„Капіталісты і памешчыкі ва што-б то ні стала жадаюць раз'яднаць рабочых розных нацый, а самі сільныя свету гэтага вельмі добра ўжываюцца разам, як акцыянеры „даходных“ мільённых „спраў“ (накшталт ленскіх прыскаў)—і праваслаўныя, і яўрэі, і рускія, і немцы, і палякі, і украінцы, усе, у каго ёсць капітал, дружна эксплаатуюць рабочых усіх нацый.

Свядомыя рабочыя стаяць за поўнае адзінства рабочых усіх нацый ва ўсіх і ўсякіх асветных, прафесіянальных, палітычных і т. д. рабочых арганізацыях. Няхай паны кадэты ганьбяць сябе адмаўленнем або змяншэннем роўнапраўя украінцаў. Няхай буржуазія ўсіх нацый цешыцца ілжывымі фразамі аб нацыянальнай культуры, аб нацыянальных задачах і т. д.

Рабочыя не дадуць сябе раздзяляць ніякімі салодкімі прамовамі аб нацыянальнай культуры, або „нацыянальна-культурнай аўтаноміі“. Рабочыя ўсіх нацый адстойваюць дружна, разам, у агульных арганізацыях, поўную свабоду і поўнае роўнапраўе— залог сапраўднай культуры“.

Усебаковая распрацоўка нацыянальнага пытання ў працах Леніна і Сталіна адыграла велізарную ролю. Яшчэ напярэдадні сусветнай імперыялістычнай вайны большэвікі паднялі ў міжнародным маштабе барацьбу супроць імперыялізма, супроць прыгнечання слабых нацыянальнасцей больш сільнымі, супроць шалёнага нацыяналізма, распальвання нацыянальнай нянавісці. За мір, за дружбу народаў вялі барацьбу большэвікі.

Надышоў 1917 г. Ленін вярнуўся ў Расію, партыя пачала рыхтавацца да штурма буржуазнага ўладарства. У перыяд падрыхтоўкі Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі большэвікі аддавалі вялікую ўвагу нацыянальнаму пытанню. На славутай красавіцкай канферэнцыі даклад на гэтую тэму рабіў таварыш Сталін. Ён разгарнуў большэвіцкую праграму вырашэння нацыянальнага пытання, якая забяспечвала ўсім народам, насяляючым нашу краіну, поўнае роўнапраўе, нацыянальны мір, поўную свабоду не на словах, а на справе.

Калі большэвікі ўзялі ўладу і пачалі фарміраваць Совет Народных Камісараў, таварыш Сталін быў назначаны народным камісарам па справах нацыянальнасцей. Ільіч надаваў гэтаму ўчастку дзяржаўнага будаўніцтва асоба вялікае значэнне, таму ён і вылучыў на гэты пост таварыша Сталіна. Ленін і Сталін сумесна склалі рад важнейшых гістарычных дакументаў, якія вызначылі асновы новага жыцця ўсіх народаў нашай дзяржавы.

Годы грамадзянскай вайны былі гадамі барацьбы і за большэвіцкае вырашэнне нацыянальнага пытання. Інтэрвенцыя імперыялістычных дзяржаў паказала,

як правы былі большэвікі, гаворачы аб тым, што ў барацьбе супроць рабочых аб'ядноўваюцца капіталісты ўсіх краін, без адрознення нацыянальнасцей. Грамадзянская вайна паказала, як верна палітыка совецкай улады. Федэрацыя Совецкіх Рэспублік з кожным годам расла і мацнела.

Годы грамадзянскай вайны былі гадамі барацьбы супроць памешчыкаў і капіталістаў. Рускі рабочы клас стварыў совецкую ўладу, якая дапамагала вызваліцца працоўным нацыянальных акраін. Гэтыя годы ўмацавалі давер'е працоўных мас нацыянальных рэспублік да вялікага рускага народу, які скінуў ланцугі векавога рабства. Рускія рабочыя не змаглі-б перамагчы Калчака, Дзенікіна, Врангеля без спачування і давер'я з боку прыгнечаных мас акраін былой царскай Расіі. Міжнародная палітыка совецкай улады—барацьба за мір, барацьба супроць імперыялізма—увесь час згуртоўвала, умацоўвала саюз нацыянальных рэспублік.

Скончылася грамадзянская вайна, краіна пачала апраўляцца ад разарэння. Ва ўвесь рост паўстала пытанне аб перабудове ўсяго ўкладу на соцыялістычных асновах, аб адзінай планавай гаспадарцы. Наша партыя па прапанове Леніна і Сталіна ставіла пытанне аб **Саюзе Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.**

Пытанне аб стварэнні СССР абмяркоўвалася на X Усерасійскім З'ездзе Советаў у снежні 1922 г., даклад па гэтаму пытанню рабіў таварыш Сталін. Ён-жа рабіў і даклад на 1-м з'ездзе Советаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік 30 снежня 1922 г. Па яго дакладу была прынята „Дэкларацыя аб утварэнні Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік". Мы адзначаем цяпер пятнаццацігоддзе гэтай славутай падзеі. У Совецкім Саюзе каля 60 нацый, нацыянальных груп і народнасцей жывуць адзінай дружнай сям'ёй.

У дакладзе на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР таварыш Сталін гаварыў: „Мінулы перыяд з несумненнасцю паказаў, што вопыт утварэння многанацыянальнай дзяржавы, створанай на базе соцыялізма, удаўся поўнасцю. Гэта ёсць несумненная перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі".

Сталінская Канстытуцыя перамогшага соцыялізма замацавала найвялікшыя дасягненні нашай радзімы, і сярод іх нацыянальнае роўнапраўе, мір і дружбу паміж свабоднымі народамі.

* * *

У нацыянальным пытанні з самага пачатку зусім асобае месца займала ўсё, што звязана з культурай. Тут вельмі ўважліва трэба было ўлічваць асаблівасці гістарычнага мінулага, асаблівасці бытавога ўкладу, асаблівасці гаспадарчых форм нацыянальных рэспублік і абласцей.

Тут асабліва патрэбны быў сапраўдны марксісцкі дыферэнцыраваны падыход. Асабліва недапушчальна была бюракратычная стрыжка пад адну грабёнку. У СССР упершыню пачала ствацца новага тыпу культура, соцыялістычная па зместу і нацыянальная па форме. Гэта выключна цікавая, захапляючая работа.

Нядаўна мне адна настаўніца, з якой мы ў 90-х гадах разам займаліся ў вячэрняй нядзельнай школе ў Валадарскім раёне Ленінграда (тадышняя Неўская застава Пецербурга), Ольга Аляксееўна Якаўлева-Філатава расказвала з вялікім захапленнем аб сваёй рабоце з рабфакаўцамі з асяроддзя народаў Поўначы. Колькі яркага, чуллівага матэрыяла паказвала яна мне аб рабоце з ледзь умеўшай чытаць моладдзю. Многія з яе вучняў зрабіліся цяпер інжынерамі, работнікамі навукі. „Я—твой сын,—пісаў Ользе Алексееўне рабфакавец,—маці мяне нарадзіла, ты мяне вучыла".

Рабфакі адыгралі выключна вялікую ролю ў гісторыі нашага культурнага развіцця. Яны адкрывалі дзверы ў вузы, расчышчалі шлях да вышэйшай адукацыі тым, для каго пры старым рэжыме былі закрыты ўсе шляхі да навучання, у тым ліку многім тысячам людзей з асяроддзя раней прыгнечаных народаў.

З якой цікавасцю слухаюць цяпер іспанскія таварышы аб гэтай форме барацьбы за культуру. „Якая гэта для нас багатая крыніца", гавораць яны.

А рабоча-сялянскія універсітэты! На конях з'язджаліся з суседніх сёлаў сяляне на заняткі ў татарскі сялянскі універсітэт. Колькі гібкасці патрэбна ў пастаноўцы работы сярод шматлікіх нацыянальнасцей нашай краіны Советаў. Я памятаю, як цікавіўся гэтай работай Ільіч, як пастаянна гаварыў ён аб неабходнасці ўчоту асаблівасцей той або іншай нацыянальнасці.

Ў школы другой ступені ў Інгушэтыі спачатку бацькі прывозілі на конях сваіх сыноў і патрабавалі, каб дзеці рассаджаны былі па родах. Родавую адчужанасць школа старалася зжыць, даючы хлапцам пабольш яркіх перажыванняў, скарыстоўваючы шырока ўсе віды мастацтва, а дысцыплінаванасць, выхаваную родавым бытам, школа ўмацоўвала, пераключаючы на новыя рэйкі.

Асабліва моцную любоў татар і рада іншых усходніх народаў да дзяцей мы стараліся скарыстаць, арганізуючы бацькоўскую грамадскасць вакол дзіцячых садоў, школ.

Было-б недарэчна думаць, што наша многанацыянальная соцыялістычная дзяржава склалася без барацьбы. Барацьба ішла на два франты з адкрытым і скрытым вялікадзяржаўным шавінізмам і з адкрытымі і скрытымі спробамі ўваскрасіць буржуазны нацыяналізм.

Яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі, у 1916 г., Ленін змагаўся супроць трацкісцкага падручнага Пятакова. У радзе артыкулаў Владзімір Ільіч з усёй рэзкасцю абрушыўся на здрадніцкія выступленні Пятакова. І не выпадкова, што Пятакоў скаціўся ў рады фашысцкай шпіёнскай банды, якая імкнулася аднавіць капіталізм у СССР.

Ажыццяўляючы лінію Леніна—Сталіна па нацыянальнаму пытанню, комуністам скрозь і ўсюды прыходзілася натыкацца на вялікадзяржаўнае забыццё патрэб нацыянальных рэспублік. Побач з гэтым прыходзілася змагацца і з буржуазным нацыяналізмам у радзе нацыянальных рэспублік. Так, шавінізм азербайджанскі накіроўваўся супроць армян, шавінізм узбекскі супроць туркменаў і казахаў і т. д.

Буржуазныя нацыяналісты ўсіх масцей у сваёй дзікай злосці супроць перамогшага соцыялізма не спыняюцца перад самымі агіднымі злачынствамі. Яны аб'ядналіся з трацкісцка-бухарынскімі наймітамі фашызма. Разам з імі яны робяць чорную справу здрады радзіме.

Але іх надзеі дарэмны. Працоўныя масы СССР, вызваліўшыся ад эксплаатацыі, падняўшыся на высокі ўзровень культуры, яшчэ цясней згуртоўваюцца, яшчэ больш горача змагаюцца за соцыялізм. Гэта лепш за ўсё даказалі выбары ў Вярхоўны Совет СССР. („Правда")

РАДАСНА І ЎПЭЎНЕНА СУСТРАКАЕ

Буду пець вясёлыя, бадзёрыя песні

Л. П. Александроўская—заслужаная артыстка рэспублікі

Быць акторам у Совецкай краіне—гэта значыць быць найшчаслівейшым акторам ва ўсім свеце. Тая ўвага, штодзённыя клопаты партыі, урада і ўсёй грамадскасці аб нас, совецкіх акторах, даюць нам столькі сілы, столькі творчай радасці, што справа працы ў нашай краіне не ёсць сродак здабычы жыццёвых даброт, але праца стала справай гонару кожнага сумленнага працоўнага. Вось чаму ў нашай краіне радасна жыць, вось чаму гучаць вясёлыя, бадзёрыя песні, вось чаму мы ўсе адчуваем сябе з кожным годам маладзейшымі, поўнымі жадання працаваць на карысць перамогшага соцыялізма, на карысць найхутчэйшай пабудовы комунізма.

Праца ў 1938 годзе абяцае быць вельмі цікавай, поўнагучнай у маім творчым жыцці. Я буду працаваць над творамі нашых совецкіх пісьменнікаў, кампазітараў, якія далі нам такія ўзоры творчасці, як „Паднятая цаліна", „Ціхі Дон" (камп. Дзержынскі), „Міхась Падгорны" (бел. камп. Цікоцкі), творы маладога беларускага кампазітара Багатырова. Буду працаваць над народнаю творчасцю. Вось, напрыклад, над песняй, напісанай кампазітарам Любанам са слоў беларускага калгасніка Адама Русака „Бывайце здаровы", якая стала шырока вядома не толькі ў нас на Беларусі, але з вялікім поспехам выконваецца ў Маскве і ў брацкіх рэспубліках і перакладзена на расійскую мову.

Народная песня—гэта невычарпальныя творчыя крыніцы для кожнага мастака. Народная творчасць сведчыць аб велізарнейшым росце нашага народа, які мае ўсе магчымасці жыць, працаваць, тварыць. Клопаты, якімі абкружаны чалавек у нашай краіне—усё гэта натхняе мяне, дае мне яшчэ большыя творчыя магчымасці працы, а ў працы—радасць, радасць жыцця, светлага жыцця, да якога прывяла нас непераможная партыя большэвікоў і яе геніяльны правадыр—вялікі СТАЛІН.

Над чым я буду работаць

РЭХТ—кандыдат сельска-гаспадарчых навук

Стаханаўскі рух у нашым соцыялістычным земляробстве дапамог шчыльна падыйсці да рэалізацыі ўказанняў таварыша Сталіна—даць краіне ў бліжэйшыя 3—4 гады 7—8 мільярдаў пудоў хлеба ў год.

Перад намі, работнікамі Навукова-даследчага інстытута балотнай гаспадаркі, пастаўлены велізарныя задачы: дапамагчы соўгасам і калгасам у падняцці ўраджайнасці; у прыватнасці перада мной, як навуковым работнікам, стаіць задача знайсці найбольш рацыянальныя спосабы задзелкі ўгнаенняў, высветліць уплыў летняй падкормкі на ўраджайнасць і прасачыць рухавасць калія і фосфарнай кіслаты і даступнасць іх для жыўлення расліны. Над гэтай тэмай я і працую.

У 1938 г. я буду прадаўжаць работу, пачатую ў 1937 г. Я буду працаваць над тэмай—вывучэнне рада ўгнаенняў, падкормкі і павышэннем агратэхнічнага фонда (лепшай апрацоўкі глебы, тэрмінаў сяўбы, гатунку насення і т. д.), з больш шырокім ахопам соўгасаў і калгасаў, размешчаных на балотных масівах. Буду імкнуцца, каб атрыманыя рэзультаты сталі шырокім здабыткам калгаснай вытворчасці.

Навукай устаноўлена, что ў стварэнні ўмоў для поўнага забеспячэння раслін на працягу ўсяго вегетацыйнага перыяда спажыўнымі вешчаствамі тэхніка ўнясення ўгнаенняў адыгрывае вялікую ролю. Глыбіня задзелкі ўгнаенняў таксама адыгрывае не малую ролю.

Я стаўлю перад сабой мэту—усе дасягнутыя вопыты шырока папулярызаваць. Аб усёй праробленай мною рабоце я пішу навуковую работу. Мною ўжо напісаны навуковыя работы ў 1936 і 1937 гг.

Я прыкладу ўсе свае сілы і веды, каб вопыты, над якімі я працую, якія даюць станоўчыя рэзультаты, былі шырока скарыстаны ў практыцы соцыялістычнай вытворчасці нашай сельскай гаспадаркі.

Менск, Усесаюзны Навукова-Даследчы Інстытут Балотнай Гаспадаркі.

Менская Кантрольна-насенная станцыя НКЗ БССР вядзе вялікую работу па вызначэнню якасці насення. На здымку: спецыяліст З. П. Дземідовіч пры дапамозе мікраскопа вызначае якасць насення ільну. Фото Мазелева (БСФ).

СОВЕЦКІ НАРОД НОВЫ 1938 ГОД

Эдзі Агняцвет

„И жизнь хороша и жить хорошо“

Я з радасцю сустракаю 1938 г. Кожны новы дзень прыносіць маёй радзіме ўсё новыя перамогі.

„И жизнь хороша и жить хорошо“.—Гэтыя словы Владзіміра Маякоўскага цудоўна адлюстроўваюць пачуцці і думкі кожнага совецкага грамадзяніна.

У нашай краіне аднолькава добра жывецца і старым, і маладым.

Я належу да таго шчаслівага пакалення, якое ніколі не бачыла ў твар гарадавога ці ўрадніка. Я ведаю аб праклятым мінулым толькі па кнігах і ўспамінах старэйшых таварышоў.

У 1937 г. я закончыла паэму пра чалавека, які ўсё сваё вялікае сэрца аддаў для таго, каб нам шчасліва і радасна жылося. Называецца гэта паэма—„Фелікс Дзержынскі“.

У 1938 мне хочацца напісаць паэму пра таленавітую совецкую моладзь, пра новага маладога чалавека–героя нашага часу, які расце і выхоўваецца Вялікай соцыялістычнай рэволюцыяй.

Напішу і песні пра нашых слаўных пагранічнікаў, пра дружбу народаў, пра любімага бацьку і правадыра ўсіх працоўных—таварыша СТАЛІНА.

Гурткі самадзейнасці пры клубе будаўнікоў (Менск) карыстаюцца вялікім поспехам у слухачоў.

На здымку: выступленне цымбалістаў на вечары стаханаўцаў у клубе імя Сталіна. Злева направа: Драчынскі І. Ю., Гальперына М. Д. і Каралінскі Э. В.

Фота І. Рабіновіча.

Радасныя перспектывы

Ю. Дворкіна—старшы навуковы работнік Акадэміі Навук БССР.

У 1937 г. я працавала ў двух напрамках—на педагагічнай рабоце ў Менскім педагагічным інстытуце і на навукова-даследчай рабоце ў Акадэміі Навук БССР. У Акадэміі Навук наш калектыў працаваў над складаннем нарысаў па гісторыі беларускай літаратуры. Гэтая ў вышэйшай ступені важная работа будзе працягвацца і ў 1938 г.

Над чым я буду ў асноўным працаваць у 1938 г.? Працаваць ёсць над чым. Многа цікавых пытанняў ставіць перад намі совецкая рэчаіснасць. Радасць працы магчыма толькі ў краіне Советаў.

І ў 1938 г. перад усімі навуковымі працаўнікамі, у тым ліку і перада мною, стаіць задача барацьбы за высокую якасць лекцый, за палепшанне выкладання, за падрыхтоўку педагагічных кадраў, цалкам адпавядаючых задачам, пастаўленым нашай рэчаіснасцю.

У галіне навукова-даследчай я буду працягваць работу над нарысам па гісторыі беларускай літаратуры. Спадзяюся, што ўвесь наш калектыў Інстытута літаратуры і мовазнаўства Акадэміі Навук БССР з гонарам справіцца з гэтай адказнейшай і ганаровай задачай.

Акрамя таго, у 1938 г. я буду прадаўжаць работу над тэмай па сваёй спецыяльнасці, па заходне-еўрапейскай літаратуры. Я ўжо працавала над тэмай „Рэволюцыйная паэзія Германіі XIX в.“ Больш за ўсё мяне вабіць фігура вялікага нямецкага рэволюцыйнага паэта Генрыха Гейне. Яго творчасць па праву займае ганаровае месца ў першым радзе антыфашысцкага літаратурнага фронта. 1938 г. будзе годам яшчэ лепшай, яшчэ больш прадукцыйнай работы ўсёй совецкай краіны. І ўвесь наш калектыў навуковых працаўнікоў сваёй работай павінен з гонарам апраўдаць давер'е і клопаты партыі і ўраду, якія адкрылі перад намі радасныя, светлыя перспектывы, далі нам магчымасць радасна працаваць для светлага будучага нашай соцыялістычнай радзімы.

Справы і людзі адной фабрыкі

Многа горкіх успамінаў у Рахілі Алескер звязана з капіталістычнай фабрыкай. Дваццаць лепшых год было аддадзена фабрыцы Калбаноўскага. Тут прайшло яе дзяцінства, яе маладосць.

У дзевяць год паступіла яна на махорачную фабрыку. Для таго, каб прынялі на фабрыку, прышлося даць вялікі хабар рабіну. Ён замест дзевяці год у метрыцы паставіў пятнаццаць. І за гэта злоўжыванне маці Рахількі доўга кланялася, доўга дзякавала. Шырока адчыненымі вачыма глядзела дзяўчынка на маці і ніяк не магла зразумець: за што яе маці так дзякуе. Яна аддала яму тыя грошы, што пазычыла ў суседак і, аддаўшы грошы, яшчэ дзякуе. Калі Рабін хаваў грошы ў кішэню, Рахілька з сумам праводзіла іх вачыма. У маленькай галоўцы ў гэты час была думка аб хлебе. Колькі маці магла-б купіць хлеба на гэтыя грошы!

— Мама, за што ты яму аддала гэтыя грошы?—ціханька спытала яна.—Ён-жа нічога не рабіў. А ў нас няма хлеба,—заглядаючы ў вочы маці, дадала Рахілька.

І тут-жа заўважыла, што буйныя слёзы цяклі ў мацеры па шчаках. Дзяўчынка раптам змоўкла. Ужо не хацелася цёплага пахучага хлеба—ёй было шкада маці, якую яна моцна любіла. Выціраючы слёзы, маці сказала:

— За тое ты, мая дачушка, зможаш цяпер пайсці працаваць, а так цябе нікуды не бралі—маленькая ды маленькая... А зараз вось з гэтай паперкай цябе возьмуць на фабрыку.

Так папала на махорачную фабрыку Рахіль Алескер.

Гаспадарыў на гэтай фабрыцы фабрыкант Калбаноўскі. Памяшканне фабрыкі невялічкае, аднапавярховае. Факты жорсткай эксплаатацыі свежы ў яе памяці і зараз.

Фабрыка была катаргай. Усе працэсы рабочыя рабілі рукамі: рэзалі табачныя лісты, набівалі пачкі, на плячах насілі скрынкі з махоркай і т. д. Працавалі ў холадзе, цемры, пыле. Працуючы побач, не бачылі адзін другога. Елі тут-жа на сталах. Хлеб—адзіная яда рабочых—быў насычан махоркай.

За работу рабочыя атрымоўвалі 40—50 кап. у тыдзень, але і гэтыя мізэрныя грошы поўнасцю ніколі не атрымоўвалі. За ўсё вылічвалі, за ўсё штрафавалі.

***

Змянілася фабрыка, а з ёй і жыццё Рахіль Алескер пасля соцыялістычнай рэволюцыі. У цяжкія гады грамадзянскай вайны яна разам з многімі старымі рабочымі не пакінула фабрыку. Рабочыя ўбачылі, што разам з капіталістычным ладам яны зверглі і Калбаноўскага, што фабрыка належыць рабочай дзяржаве і што гаспадары фабрыкі—гэта яны самі.

З году ў год расла фабрыка. Не пазнаць цяпер яе,—займае яна амаль цэлы квартал. Новыя фабрычныя карпусы выраслі на месцы гнілых хібарак. Многа святла і паветра ў цэхах фабрыкі, яны вабяць чыстатой і захвочваюць да дружнай і лёгкай работы. У распрацовачным цэху стаяць жывыя кветкі. Усе працэсы механізаваны, усе цэхі звязаны паміж сабой канвеерам. Новы чалавак не заўважае, як у яго над галавой, радам з ім, нешта рухаецца, паўзе далей, каб дзесьці скончыцца.

Рабочыя спакойна і ўпэўнена стаяць ля машын і толькі сочаць за імі. З работы яны ідуць не брудныя. Ніякага пылу няма і ўсюды чыстата і парадак, праца для рабочых стала свабоднай і лёгкай.

Маладым рабочым не верыцца, што калісьці ў цэхах было не так, што калісьці ў цэх трэба было прыносіць кацялок з гарачымі вуглямі, каб сагравацца. Па іх думцы так, а не інакш, павінна было быць і раней.

З году ў год Віцебская махорачная фабрыка перавыконвае план. План другой пяцігодкі фабрыка скончыла датэрмінова. План 1937 года таксама даўно выканан. Заданне на 1937 г. было 405.000 скрынак—гэта колькасць выканана. Дадзена звыш плана 25.000 скрынак і гэта да дня выбараў у Вярхоўны Совет—12 снежня—перавыканана: зроблена 25.700 скрынак.

Фабрыка па выкананню плана, па якасці прадукцыі займае першае месца ў Совецкім Саюзе. Калектыў рабочых ужо некалькі год трымае пераходны сцяг Галоўтабака. Некалькі разоў рабочы калектыў прэміраваўся асабіста т. Мікаянам. Фабрыка ганарыцца сваімі ордэнаносцамі, якіх яна выхавала: т. Школьнік—былы рабочы з 40-гадовым вытворчым стажам, зараз кіруе гэтай фабрыкай; лепшая стаханаўка—брыгадзір-ордэнаноска тав. Лур'е. Фабрыка ганарыцца сваімі лепшымі стаханаўцамі Александравай, Воранавай, Церэшчанка, якія выконваюць планавыя заданні на 200 і больш процантаў. Фабрыка ганарыцца ўсім сваім рабочым калектывам.

Сярод стаханаўцаў фабрыкі і ўсяго рабочага калектыва пачэснае месца займае 55-гадовая стаханаўка Рахіль Алескер. Не гледзячы на свае гады, яна і не думае пакідаць фабрыку. Толькі пры Совецкай уладзе яна ўбачыла, чым сталі рабочыя, раней некультурныя, непісьменныя і забітыя.

Не гледзячы на свой узрост, сваю норму тав. Алескер заўсёды перавыконвае. Працуючы на ўпакоўцы, замест 90 скрынак—выпускае 120. За работу яе часта прэміруюць. Яна атрымала прэмію ад наркома т. Мікаяна. У мінулым годзе фабрыка яе прэміравала пуцёўкай на курорт. Атрымала, як лепшая стаханаўка, грамату. Штогод пасылаюць адпачываць у санаторый або дом адпачынку. Некалькі разоў была на курорце.

Новы 1938 г. махорачная фабрыка сустракае новымі поспехамі, новымі перспектывамі. 1938 г. будзе першым годам трэцяй пяцігодкі. Рабочы калектыў фабрыкі распрацаваў ужо пяцігадовы план, у якім намячаецца выпрацаваць 2.560.000 скрынак махоркі, з якіх 870.000 вышэйшага гатунку.

У сэрцах рабочых жыве пачуццё вялікага гонару за свае поспехі, за поспехі і магутнасць краіны.

Петроўская.

У НАС ГЭТА ЗВЫЧАЙНА

У нас на швейнай фабрыцы „Кастрычнік“ нядаўна была замежная дэлегацыя. Яна цікавілася метадамі нашай стаханаўскай работы, умовамі работы рабочых. А што іх асабліва цікавіла, дык гэта як я—жанчына, прычым не маючая бацькоў, займаю кіруючую пасаду намесніка такога велізарнага прадпрыемства. Як гэта я і другія звычайныя работніцы, носім ордэны на грудзі. Я тады прама і адказала ім:

— Паважаныя госці! Гэта магчыма ў нас, у краіне соцыялізма, у краіне, дзе жанчына мае адналькавыя правы з мужчынай, дзе праца лічыцца справай гонару, справай чэсці, справай доблесці і гераізма. Мяне, як і многіх другіх, выхоўвае партыя большэвікоў, совецкі ўрад.

Так, мяне выхаваў і ўзрасціў комсамол, партыя Леніна—Сталіна. Таму я многім абавязана ім. Усе свае сілы, усё сваё жыццё аддам на карысць нашай слаўнай радзімы.

Па сканчэнні фабзавуча ў 1930 г. мяне накіравалі працаваць на менскую фабрыку „Кастрычнік“, дзе я расла, выхоўвалася і працую зараз намеснікам дырэктара фабрыкі.

Двухтысячны калектыў нашай фабрыкі ў новы 1938 год уступіў з добрымі паказальнікамі.

Гадавы план 1937 г. датэрмінова выканан: калектыў ордэнаноснай фабрыкі даў прадукцыі звыш плана на 1.165.000 руб.

Сотні стаханаўцаў нашай фабрыкі паказалі выдатныя ўзоры большэвіцкай барацьбы за высокую прадукцыйнасць. На фабрыцы ёсць двухсотнікі, трохсотнікі. Колькасць стаханаўцаў толькі за апошнюю сталінскую дэкаду павялічылася з 614 чалавек да 645.

Людзі імкнуцца усё наперад. Наша задача дапамагчы ім. Мы часта аб усёй масе стаханаўцаў забывалі, а займаліся падрыхтоўкай рэкордаў адзіночак. У 1938 годзе такой практыцы будзе пакладзен канец. Дырэкцыя ставіць перад сабой задачу—арганізаваць так работу, каб усе рабочыя, усе цэхі фабрыкі давалі ў 2—3 разы больш прадукцыі. Справа толькі за намі—кіраўнікамі.

Паспяховая работа ў канцы снежня 1937 г. з'явілася своеасаблівай рэпетыцыяй для ўступлення ў новы 1938 г.

У першы год трэцяй сталінскай пяцігодкі фабрыка „Кастрычнік“, па папярэдняй намётцы, павінна выпусціць прадукцыі на 40.680.000 руб., альбо на 115.000 штук больш, чым у мінулым 1937 г. Сёлета фабрыка павінна асвоіць 10 новых фасонаў.

Пры правільнай арганізацыі работы і кіраўніцтве разам з усім калектывам мы з гэтымі задачамі справімся.

Я буду дабівацца таго, каб наша фабрыка па выкананню плана 1938 года вышла ў перадавыя рады прадпрыемстваў горада Менска і наогул Беларускай Рэспублікі.

Менск. **Еўсюціна**

На Менскай швейнай фабрыцы (8-га сакавіка) штодзённа праводзіцца вытворчая фізкультурная зарадка.
НА ЗДЫМКУ: Фізкультурная зарадка ў першым цэху. **Фота Горэвога (Белсаюзфото).**

СОВЕЦКІ НАРОД ЛЮБІЦЬ І НІКОЛІ НЕ ЗАБУДЗЕ ВЯЛІКАГА РУСКАГА ПАЭТА-ДЭМАКРАТА Н. А. НЕКРАСАВА

Сялянскія дзеці

Н. А. НЕКРАСАЎ



Нікалай Алексеевіч Некрасаў

Ізноў я у вёсцы. З вялікай ахвотай
Пішу мае вершы. Хаджу паляваць.
Змарыўшыся ўчора хадзьбой па балотах,
Зайшоў у гумно быў на сене паспаць.
Прачнуўся: скрозь шчыліны сонца
Глядзяць на мяне каснікі.
Варкуе галубка; бясконца
Крычаць маладыя гракі.
Вось цень замільгала за рэдкім закатам,
Па цені пазнаў я — варона ляціць.
Чу! шопат якісьці... Прыслухаўся, хто там,—
Чародка праз шчыліну вочак глядзіць!
Ўсё шэрыя, карыя, сінія вочы—
Як кветкі у полі вясной.
Мільгаюць, іскрацца, як зоркі уночы,
Пакоем і ласкай, свабодай святой!
Люблю я дзіцячых вачэй выражэнне,
Ў іх свеціць адна дабрата.
Замёр я: кранула душу расчуленне...
Чу! шэпат ізноў!

Першы голас

„Барада!

Другі

А пан-жа сказалі!..

Трэці

Цішэй, не крычыце!

Другі

Ў паноў толькі вусы бываюць—дальбог!

Першы

А ногі, як жэрдкі, даўгія. Глядзіце!

Чацверты

А вунь і гадзіннік ляжыць каля ног!

Пяты

Ай, важная штучка!

Шосты

Мо‘ сотню ён варты...

Сёмы

Дык дзіва, што варты!

Восьмы

Як сонца гарыць!

Дзевяты

А вунь і сабака—вялікі, стракаты!
Вада з языка-то бяжыць.

Пяты

А стрэльба якая!.. Напэўна, багаты...
Дзве рулі ў стваліне...

Трэці (*спалохана*)

Глядзіць!

Чацверты

Уцякайма! Сярдзіты ён дужа!

Трэці

Прыб‘е...“

Напужаліся і уцякаць
Пусціліся прэч: чалавека пачуўшы,
Вераб‘і так з мякіны чародкай ляцяць.
Заціхшы, прышчурыўся я. Асмялелі
Шпіёны мае, вось ізноў яны тут.
Усё, што са мною было, аглядзелі
І вынеслі мне свой прысуд:
— Такому-то гусю, ну што за ахвота
Цягацца з сабакам у спёку, дажджы!
І мусіць не пан, бо як ехаў з балота,
Дык поплеч з Гаўрылам... „Пачуе, маўчы!“
О, мілыя плуты!... Хто часта іх бачыў,
Той, веру я, любіць сялянскіх дзяцей;
Ды нават калі-б з вас глядзеў хто іначай
На іх, як на „нізкага роду людзей“,—
Усё-такі мушу прызнацца адкрыта,
што часта зайздрошчу я ім:
У жыцці іх так многа паэзіі зліта.
Як дай бог пястованым дзеткам тваім.
Шчаслівы народ! Ні пяшчот, ні навукі—
Не ім пра усё гэта знаць!
Я часта улетку браў кошык у рукі,
Ішоў з імі разам грыбы сабіраць.
Стараўся нагледзець мясцечка грыбное,
А рана не мог ні за што адшукаць.
„Глядзі ты, Савося, вунь колца якое!“
Мы разам нагнуліся тут-жа і хваць
Змяю! Я падскочыў: ужаліла ў ногу!
Савося рагоча: „папаўся, прастак!“
Затое мы потым губілі іх многа
І клалі радком на пярылы маста.
Напэўна, за гэта мы славы чакалі.
Як раз-жа дарога ляжала сюдой:
Рабочага звання тут людзі снавалі

Без ліку па ёй.
Капальнік канаў валгажанін,
Лудзільшчык, кравец і пячнік,
А то ў манастыр гаражанін
Пад свята прамчыць на кані.
Пад нашы густыя цяністыя вязы
Цягнула з дарогі людзей.
Рэбяты абступяць: пачнуцца расказы
Пра Кіеў, пра турка, пра дзіўных звярэй.
Другі падгуляе, пацеха ды годзе!
Аж збрыдзее слухаць яго.
Пачне з Валачка, а да Кіева дойдзе!
А потым і прытчу дадасць да ўсяго:
„Бывайце! Старайцеся, знайце, рэбята,
На госпада бога ва ўсім патрапляць:
У нас быў Вавіла, ў сяле найбагаты,
Ды ўздумаў на госпада ён наракаць,—
Збяднеў з таго часу Вавіла. Не стала
Ні мёду ад пчол, ні ўраджаю з зямлі,
І толькі ў адным вось яму шанцавала,
Што з носа валоссі, як хвораст, раслі...“
Рабочы расставіць, разложыць прылады—
Рубанкі, напілкі, стамескі, нажы:
„Глядзі, чарцяняты!“ А дзеці і рады,
Як стружаш, як лудзіш—усё пакажы.
Праходжы часамі засне на мінутку,
Рэбята давай пілаваць і стругаць!
Затупяць пілу—не навострыш за суткі!
Паломяць свярдзёлак—і ходу ўцякаць.
Бывала, тут цэлыя дні праляталі,
Што новы праходжы, то новы расказ...
Ух! горача!.. Доўга грыбы мы збіралі.
Вось з лесу выходзім—насустрач якраз
Рачулка вiецца істужкай даўгою:
Рэбята саскокнулі ў воду гурбой,
І русых галовак над рэчкай пустою,
Што белых грыбоў на палянцы лясной!
Рака зашумела ад дружнай работы,
Крычыць і смяецца ў вадзе дзетвара...
А сонца іх паліць паўднёвай спякотай.
Дадому, рэбяткі! Абедаць пара.
Вярнуліся. Поўны у кожнага кошык,
А колькі расказаў! Ля самай ракі
Спалохалі зайца, папаўся ім вожык
І бачылі воўка... у, страшны які!
Нясуць яны вожыку мушак і мошак,
Карней прапануе сваё малачко—
Не есць і не п'е наравісты той вожык!
Ну, што-ж. Адышліся...
Хто ловіць жучкоў,
Хто няньчыць сястрычку маленькую Глашку,
Хто цягне на пашню вядзерца кваску,
А той, падвязаўшы пад горла рубашку,
Рысуе затоена штось на пяску;
А там вунь дзяўчынка з абновай гуляе,
Спляла сабе слаўны вянок,
І рада бясконца вяночку малая,
З ім бегае, скача, не чуючы ног.
Там спяць на прыпёку, там скачуць ў прысядку.
Вось кошыкам коніка ловяць дзяўчаткі.
Злавіла адна з іх, і едзе бягом.
Не ёй-жа, народжанай летам у полі,
Прынесенай маткай дахаты ў прыполе,
Баяцца рахманага Коські свайго?..

Грыбная пара адыйсці не паспела,
Глядзі— ўжо чарнюткія губы ва ўсіх,
Набілі аскому: чарніца даспела!
А там і маліна ўжо вабіць малых!

Дзіцячыя крыкі і звонкае рэха
Ад ранку да ночы грымяць па лясах.
Спужаная песняй, ауканнем, смехам
Узнімецца птушка з гняздзечка ў кустах
Ці зайчык ускочыць—садом, суматоха!
Аднойчы глушэц з аблінялым хвастом
У кустах замарудзіў... злавілі жывога!
І ў вёску вясёлыя цягнуць гуртом...
— Даволі, Ванёк! адгуляў ты, дзіцятка,
Пара за работу, сын мой!—
Ды нават і праца для Вані спачатку
Пакажацца іначай—зусім не цяжкой:
Ён бачыць, як бацька зямлю урабляе,
Як кідае ў рыхлую пахаць зярно,
Як поле пасля зелянець пачынае,
Як колас расце, налівае зярно.
Гатовае збожжа падрэжуць сярпамі,
Навяжуць снапоў, у гумно прывязуць,
Прасушаць, малоцяць—малоцяць цапамі,
Ў млыне перамелюць і хлеб напякуць.
І свежага хлебца пад'еўшы, хлапчына
Вясёлым у поле імчыцца бягом.
Ці сена наложыць: „залазь, малайчына!“
Ванюха у вёску ўязджае царом.
Ды зайздрасць, аднак-жа, у панскім дзіцяці
Пасеяць было-б нам шкада.
І так, мы павінны таму паказаць і
З другое старонкі медаль.
Дапусцім, сялянскі дзіцёнак свабодна
Расце без навук і турбот,
Ды вырасце ён, калі богу заўгодна,
А згінуць яму то няма перашкод.
Дапусцім, ён знае лясныя дарожкі,
Гарцуе вярхом на кані між дубраў,
Затое без жалю ядуць яго мошкі,
Затое ён рана работу пазнаў...

Аднойчы сцюдзёнай зімовай парою
Я з лесу выходзіў; быў моцны мароз.
Гляджу я—пад гору маруднай ступою
Варушыцца конік, з ім хворасту воз.
І важна шагаючы ўперад з лагчыны,
За повад каня вёў малы мужычок
У ботах вялікіх, кажусе аўчыным,



НА ЗДЫМКУ: Ілюстрацыя мастака Лебедзева (1877 год) да верша Н. А. Некрасова „Сялянскія дзеці“. Рэпрадукцыя.

У бацькавай шапцы... а сам з нагаткі
— Дзень добры, хлапчына!—„Ты мне незнаёмы!“
— Вельмі-ж ты грозны, як я пагляджу!
Адкуль гэты хвораст?—„Ды з лесу, вядома;
Там бацька сячэ, ну а я вось важу“.
(У лесе чуваць быў тапор дравасека).
— А што, ў твайго бацькі вяліка сям‘я?
„Сям‘я немалая, ды два чалавекі
Ўсяго нас мужчынаў: мой бацька ды я...“
— Дык вунь яно што! А як зваць цябе?—„Уласам“.
— А колькі-ж гадкоў табе?—„Сёмы настаў...
Но, мёртвы ты!“ крыкнуў малышык той басам,
За повад шмаргнуў і хутчэй зашагаў.
Ад‘ехаўся хлопчык; я-ж, стоячы ззаду,
‘Шчэ доўга услед пазіраў.
Здавалася, гэта было ненапраўду,
Нібы у дзіцячы тэатр я папаў!
Ды хлопчык быў хлопчык, жывы, не картонны,
І сані, і хвораст, і гнедзенькі конь,
І снег, што ўсе хаты завеяў па вокны,
Зімовага сонца халодны агонь—
Сапраўднае усё тут мяне акружыла,
Усё, што з дзяцінства знаёмае нам,
Што рускай душы там пакутліва міла
Што рускія думкі ўсяляе людзям,
Сумленныя думкі, якім няма волі,
Якім няма смерці—даві не даві,
Ў якіх гэтак многа і злосці і болю,
Ў якіх гэтак многа любві!
Гуляйце-ж, рэбяткі! Расціце на волі!
На тое вось вам і дзяцінства дано,
Каб вечна любіць гэта беднае поле,
Каб вечна здавалася мілым яно.
Хавайце набыткі свае векавыя,
Любіце вы хлеб запрацованы свой—
Няхай успаміны дзяцінства жывыя
Праводзяць вас ў нетры зямелькі сырой!..

А зараз пара нам вярнуцца к пачатку.
Заўважыў я—дзеці цікуюць смялей,—
— Зладзеі!—крычу я Фінгалу з аглядкай:
— Украдуць, украдуць! Хавай-жа хутчэй!—
Фінгалка мой скурчыў сур‘ёзную міну,
Пад сена пажыткі мае закапаў,
Старанна і ўважна схаваўшы дзічыну,
Ля ног маіх лёг—і сярдзіта бурчаў.
Шырокая вобласць сабачай навукі
Яму дасканала знаёмай была;
Пачаў ён такія выкідываць штукі,
Што публіка з месца сыйсці не магла,
Рагочуць рэбяты! Цяпер не да страху!
Камандуюць самі!—„Фінгалка, памры!“
— Не застуй, Сяргей! Не штурхайся, Кузяха!
— Глядзі—памірае—ляжыць дагары!“
З прыемнасцю я паглядаў тут на сена
За гэтаю мілай забавай дзяцей.
І раптам сцямнела. Так хутка на сцэне
Цямнее, калі у парадку падзей
Павінна граза пранясціся з дажджамі.
І праўда: ударыў раскацісты гром,
Вада палілася ў гумно ручаямі,
Акцёр забрахаў, а рэбяты бягом!
Адкрыліся дзверы ў гумне, заскрыпелі,
І з шумам закрыліся зноў у той час.
Я выглянуў: цёмныя хмары віселі
Над нашым тэатрам як раз.
Пад буйным дажджом у сяло уцякала
Чародка знаёмых дзяцей...
Граза перасціхла, і хутка з Фінгалам
Мы вышлі шукаць дупялей.

Пераклад А. Якімовіча.



На здымку ілюстрацыя да паэмы Н. А. Некрасава „Мароз—красны нос“.

Усімі сіламі сваёй душы
марыў Некрасаў аб дастатку і шчасці народа.

Дастатак і шчасце народу прынесла партыя Леніна—Сталіна.

Слова дэпутата

Самым шчаслівым момантам у маім жыцці быў дзень 12 снежня 1937 г., дзень, калі я сама галасавала ў Вярхоўны Совет, і калі працоўныя Асіпавіцкай акругі абралі мяне дэпутатам Совета Саюза.

Нехапае слоў, каб выказаць сваю радасць і сардэчную падзяку маім выбаршчыкам за аказанае мне давер'е. Давер'е народа! Якую вялікую адказнасць усклада на мяне гэтае давер'е!

З выключнай увагай і хваляваннем я чытала і вывучала прамову таварыша Сталіна, якую ён гаварыў сваім выбаршчыкам напярэдадні 12 снежня. Словы правадыра з'яўляюцца пуцяводнай зоркай для кожнага дэпутата Вярхоўнага Совета СССР. Я добра запомніла словы таварыша Сталіна, што дэпутат з'яўляецца слугой народа, яго пасланцом у Вярхоўны Совет. Гэты наказ я заўсёды буду помніць. Я даю большэвіцкае слова, што прыкладу ўсе свае сілы, каб апраўдаць давер'е выбаршчыкаў, буду працаваць не пакладаючы рук, каб зрабіць жыццё нашага народа яшчэ больш квітнеючым, заможным і культурным. Буду змагацца, каб да канца знішчыць усіх тых, хто ўздумае стаць упоперак дарогі нашаму свабоднаму народу.

Я ў мінулым дачка сялянінабедняка, атрымала ў краіне соцыялізма магчымасць быць абранай дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР. Гэта магчыма толькі ў нас у СССР. Гэта шчасце дала мне партыя Леніна—Сталіна, совецкая ўлада, Сталінская Канстытуцыя і наш Сталін

Я ўжо атрымала пасведчанне дэпутата Вярхоўнага Совета. 12 студзеня 1938 года збіраецца першая сесія Вярхоўнага Совета. З нецярплівасцю чакаю я гэтага дня, калі цягнік павязе мяне туды ў Маскву, у Крэмль, туды, адкуль наш дарагі Сталін яркімі праменнямі асвятляе наш шлях.

Абяцаю сваім выбаршчыкам быць адданым барацьбітом сталінскай закалкі. Абяцаю ніколі не зыходзіць са шляху, які ўказваюць нам геніяльны Ленін і вялікі Сталін.

Я буду працаваць так, як вучыць нас большэвіцкая партыя. За шчасце народа, за шчаслівае заможнае жыццё рабочых, калгаснікаў, за дарагую радзіму, калі будзе патрэбна, аддам самае дарагое—сваё жыццё!

Дэпутат Совета Саюза ад Асіпавіцкай Выбарчай Акругі

Надзежда Сямёнаўна Леліна

Школа ліквбеза арганізавана пры швейнай фабрыцы „15-годдзе Кастрычніка", у горадзе Алма-Ата (Казахстан). У школе 4 групы, ў якіх вучацца 90 работніц.

НА ЗДЫМКУ: Стаханаўкі—работніцы выдатніцы вучобы. Злева направа (на пярэднім плане)—Ахатаева Хаўтой, Джэтіспаева Культжа і Майлібаева Нузогайча за вучобай. Фото Акмелінскага (Саюзфото).

Навагодняя ёлка

Барадаты дзед-мароз, сапраўдны, а не з ваты, у вялікай лахматай шапцы, кажуху, валёнках і з палкай у руках яшчэ раз аглядзеў цёплым, прыязным поглядам дзяцей, якія сабраліся каля яго і, калі дзеці супакоіліся, пачаў гутарку.

— Цяпер, калі я высветліў, што вы добрыя, цярплівыя дзеткі, будзеце ўважліва слухаць мяне— старыка, я вам нешта раскажу...

— Дзядулька, просім. Раскажы, раскажы!—пачулася з усіх бакоў.

І дзед-мароз ізноў пачакаў з мінутку, пакуль яго юныя слухачы супакояцца і сціхнуць.

Гэта шчырая гутарка дзеда з дзецьмі адбывалася ў адным з рабочых клубаў сталіцы БССР— Менска, у святочны новагодні дзень, калі ў клуб сабраліся не зусім звычайныя для яго наведвальнікі—дзеці металістаў, дзеці фрэзероўшчыкаў, кацельшчыкаў, ліцейшчыкаў, сямігадовыя і старэй, прышлі нарадныя, румяныя, вясёлыя на свята радасці, арганізаванага ім заводам.

Дзед-мароз усадзіў да сябе на калені пяцігадовага малыша,— які спачатку не зусім даверліва аднёсся да ласкі старога, а потым моцна абняў яго сваімі ручонкамі,—і расказваў ціха.

Дзядуля ўспамінаў:

— Мне было тады, як многім з вас зараз, адзінаццаць год.

... Аднойчы, як і цяпер пад новы год, я разам з двума таварышамі зварочваўся да дому. Мы праходзілі каля высокага дома гаспадара шклянога завода і былі здзіўлены, што ў гэты вечар дом быў па асаблівому асветлены... Мы спыніліся.

— Пан сваім дзецям ёлку ўпрыгожвае,—сказаў нехта.

Мы не выцерпелі і падышлі да вакон і, узабраўшыся на высокі фундамент, сталі ўглядацца. Пасярод вялікага пакою, залітага залатымі агнямі, стаяла ёлка. Я ахнуў ад нябачнага відовішча. Але ў гэтую самую мінуту нехта бессардэчна рвануў мяне за нагу і з усёй сілы кінуў на прамёрзшую зямлю. Скрозь туман я пачуў сярдзіты крык „па вокнах, злодзей, лазіць, абакрасці хочаш!.“ Ад моцнага ўдара абнешта цвёрдае ў мяне пацякла з носу кроў, я вывіхнуў сабе руку. Боль сціснуў мяне. Я не мог паварушыцца, акрамя таго



Весела і радасна працоўныя БССР сустрэлі новы 1938 год. На фабрыках, заводах і клубах адбыліся масавыя гулянні.

На Менскай фабрыцы імя Кагановіча 1-га студзеня адбыўся бал-маскарад.

На здымку: група ўдзельніц балета (злева направа ніжні рад)—т.т. Суботка Геня, Леорка Тамара, Леорка Люся, Груман Шура (верхні рад)—Бальцэвіч Міль і Юхо Лена.

крыўда разанула мяне па сэрцу...

— Ну, як дзеці, не сумна слухаць.

— Не, дзядулька, не, расказвай далей,—у адзін голас папрасілі дзеці.

— Я ўспомніў гэта для вас,— працягваў стары рабочы, адзеты ў касцюм дзеда-мароза, — адзін вечар з свайго дзяцінства. Бачыце, як яно не падобна на ваша. Нас тады, нават, не пускалі глядзець на ёлку... а зараз, зараз для вас, совецкіх дзяцей, наша партыя будуе дварцы, арганізоўвае курорты, аздаравіцельныя лагеры, будуе цудоўныя сталінскія школы. Усяго нават не пералічыш. А ў час канікул няма ў нашай краіне чалавека, які-б не думаў аб тым, як вам весялей і радасней адпачыць... Я не памылюся, дзеці, калі скажу, што ў гэтую самую мінуту, калі мы з вамі весялімся тут, каля прыбраных бліскучых ёлак, з рознакаляровымі агнямі і серабрыстымі зоркамі,—весяліцца ўся совецкая дзетвара нашай радзімы—і на заставах, што ў пяці кроках ад граніцы, і ў новых прасторных калгасных клубах, на Палессі, у берагоў Чорнага мора, на Далёкім Усходзе... усюды, усюды.

Потым дзед-мароз узяў за рукі двух меншых дзяцей і ў вясёлым акружэнні сваіх юных прыяцеляў пайшоў паказваць ім зялёную іглістую ёлку, якая стаяла пасярод залы. Высокая як башня, яна горда стаяла на віду ўсіх. Шырокая ўнізе, яна паступова звужалася кверху і на самай яе вярхушцы блішчэла вялікай срэбная зорка... Густая, галіністая ёлка была ўся ўбрана рознымі ўпрыгожаннямі, іх было так многа, што ўзнікала пытанне, як тонкія галінкі ёлкі вытрымліваюць увесь гэты цяжар.

Ля ёлкі арганізавалі карагод... Дзед-мароз, сапраўдны, жывы, забыўшыся на свае гады, нібы памаладзеў у гэты вечар, узяўшыся за рукі са сваімі сямі-васьмі-дзевяці і дзесяцігадовымі унучатамі, танцаваў так бадзёра і весела, што яго лахматая шапка з'ехала на бок.

—... Песню, дзеці, песню пра ёлку...—і ўсе хорам запелі песенку аб ёлцы, якая жыла-была ў лесе стройная, прыгожая, на радасць усім дзецям папала ў госці ў клуб.

У гэты самы вечар, калі ў рабочым клубе ля ёлкі, высокай як башня, зялёнай, як марская вада, весяліліся і гулялі дзеці мецкіх металістаў—такія-ж ёлкі былі ў кожнай кватэры, кожным клубе і кожнай школе.

Але „начальнікам" усіх ёлак у гэты святочны вечар была багатая ёлка ў сталічным Палацы піянераў і окцябрат...

Ля ўвахода, пераліваючыся агнямі, ззяе далёка бачны лозунг, які выражае агульныя пачуцці і думкі совецкіх дзяцей: „Дзякуй роднаму Сталіну за шчаслівае дзяцінства"... Гэтае дзякуй у адзін голас выражае ўся многамільённая совецкая дзетвара, і да самага Крэмля, дзе жыве мудры Сталін, дакатваюцца гарачыя словы шчырай ўдзячнасці...

Маладых гасцей сустракае ў вестыбюлі такі-ж дзед-мароз, як і ў тым клубе, сапраўдны, а не з ваты... Дзед-мароз горача вітае кожнага госця і просіць яго не адмовіць наведаць „зімовы сад"... На гэты вечар Палац быў ператворан ў цудоўны зімовы сад, усыпаны снегам. Казачны сад!!! На высокіх качэлях агромністыя папугаі. Пад столлю, сярод сіняга неба, ззяюць зоркі і над імі сагнуты рог халоднай луны... Па залах расхаджваюць і весяляць дзяцей смешныя гарманісты, яны сёння непазнавальныя... Вось маленькі „кот-катафеевіч" важна расцягвае гармонь. Дзеці задорна танцуюць... А вось тут указацель „прама пойдзеш — лакамства знойдзеш, налева пойдзеш—казкі знойдзеш, направа пойдзеш — цацкі знойдзеш"—дапамагае дзецям разабрацца ў гэтым мностве забаў, якія падрыхтаваны тут.

Не сціхаюць карагоды каля ёлак. Іх некалькі у Палацы... Амаль бесперапынна грае дзіцячы струнны аркестр. У суседнім пакоі дзяўчынкі, апранутыя ў каўказскія касцюмы, лёгка танцуюць лезгінку.

У тэатральнай залі самі дзеці разыгрываюць захапляючую п'есу „Палярная Ноч". У ёй расказваецца аб тым, як дзеці марылі сустрэцца з нашым вядомым лядовым камісарам О. Ю. Шмідтам і як збылася гэта мара... Хіба можна апісаць радасць дзяцей, калі да іх прылятае сам Шмідт!..

Хутка поўнач... Пара дамоў... Зварочваючыся па зімніх прыціхшых вуліцах, дзеці ажыўлена дзеляцца багатымі ўражаннямі вечара...

Е. Садоўскі.

ШЧАСЛІВАЯ ДЗЕТВАРА

Задаўга да новага году дзіцячыя сады Нова-Беліцы пачалі рыхтавацца да ёлкі. Гэта быў для нас гарачы час. Мы, загадчыкі садоў, шныралі па крамах і кожны жадаў купіць цацкі прыгажэйшыя, чым у другіх. Выхавальніцы таксама спаборнічалі паміж сабой на лепшае ўпрыгожанне ёлак.

Што сказаць аб дзецях? Іх захапленню не было канца.

Яны развучвалі спецыяльныя песні, рыхтавалі пляскі і па пальчыкам лічылі, колькі дзён яшчэ засталося чакаць.

Настаў гэты доўгачаканы навагодні дзень. Якое гэта было радаснае свята для рэбят! Гледзячы на іх прыгожыя тварыкі, слухаючы іх вясёлыя песні, я мімаволі падумала аб мільёнах дзяцей капіталістычных краін, якія пазбаўлены шчаслівага дзяцінства. Яны думаюць не аб ёлках, а аб тым, дзе дастаць кавалак хлеба. Успомнілася і сваё дзяцінства, бязрадаснае, галотнае. Памятаю, як зайздросцілі мы дзецям багатых, якія кружыліся вакол новагодняй ёлкі. Памятаю, як, стоячы пад вокнамі, хацелася хоць раз узглянуць на дзеда-мароза.

Ад усёй душы хацелася крыкнуць нашым рэбятам:

— Шчаслівыя дзеткі, слаўце вялікага Сталіна, які прынёс вам такое цудоўнае дзяцінства!

Н.-Беліца. **Шэвелева.**

СОВЕЦКІЯ ДЗЕЦІ — САМЫЯ ШЧАСЛІВЫЯ ДЗЕЦІ Ў СВЕЦЕ

ВЫНІКІ СТАХАНАЎСКАЙ РАБОТЫ

Талочынскі раён належыць да ліку ільнаводчых раёнаў Совецкай Беларусі. Доўгія гады ён адставаў, амаль штогодна не выконваў плана ільнапаставак перад дзяржавай.

У 1937 г. Талочынскі раён вышаў на адно з першых месц у рэспубліцы па выкананню плана ільнапаставак перад дзяржавай. Гэтага ён дасягнуў дзякуючы правядзенню ў жыццё пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання.

Раён дасягнуў такіх выдатных паказчыкаў у гэтай галіне таму, што стаханаўскі рух у раёне шырыцца, рады стаханаўцаў растуць. Штодзённа ішла непрымірымая барацьба з ворагамі калгаснай справы як на месцы ў раёне, так і ўнутры калгасаў.

На 1 студзеня новага 1938 г. план па ільнапрадукцыі раёнам выканан на 128 процантаў. Асобныя калгасы раёна выканалі дзяржаўны план і прадаўжаюць здачу ільнавалакна, ільнанасення і трасты.

Высокімі сталінскімі ўраджаямі заваявалі сабе славу ў раёне калгасы „Праўда", Друцкага сельсовета, „Барацьбіт", „Чырвоны Окцябр", Волкаўскага сельсовета, і іншыя.

Калгас „Барацьбіт", Рытамскага сельсовета, аднаго ільну толькі пасеяў 33 гектары і з кожнага гектара атрымаў 6,1 цэнтнера ільнапрадукцыі. Дзяржаўны план ільнавалакна ён перавыканаў у 3 разы. Па заданню трэба было здаць 52 цэнтнеры, а ён здаў 151,40 цэнтнераў высокім нумарам. За ільнапрадукцыю, здадзеную дзяржаве, калгас атрымаў прыбытку 103,696 рублёў.

Калгас „Праўда", Друцкага сельсовета, здаў дзяржаве 122 цэнтнеры ільнавалакна.

Усяму раёну вядомы знатныя стаханаўкі Зіна Палякова, Салаў'ёва Мар'я, як лепшыя майстры ільну. Звеннявая з калгаса „Камбайн", Саколінскага сельсовета, на сваім паказальным участку атрымала з гектара 13 цэнтнераў ільнавалакна. 13 цэнтнераў ільнавалакна дабілася з гектара і звеннявая Шанціла Паўліна з калгаса „2-я Пяцігодка". Гэтага -яны дабіліся дзякуючы сваёй любві і адданасці да работы. Гэтыя людзі карыстаюцца вялікай павагай сярод усіх калгаснікаў раёна.

Народны Камісарыят Земляробства Беларусі адзначыў выдатную работу знатных ільнаводак Талочынскага раёна Мар'і Салаўёвай, Зіны Паляковай і прэміраваў іх грашовай прэміяй.

Елісеева.

Наша праца спорыцца

Стаханаўка ільнаводства тав. Валентовіч.

Высокі сталінскі ўраджай патрабуе ад нас, калгаснікаў, добрай і своечасовай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Да вясны мы павінны рыхтавацца з восені. Вось і зараз трэба пачаць рамантаваць інвентар, клапаціцца аб насенні, каб к першаму выезду ў поле было ўсё гатова. Тады наша работа будзе спорыцца.

Я на калгаснай рабоце працую звыш чатырох год. На адказнай толькі сёлета.

Вясной 1937 года мяне выдзелілі звеннявой па ільну. Першае, што я зрабіла, прыступаючы да сваёй работы, гэта падабрала людзей у сваё звяно. Пад маім кіраўніцтвам было 9 жанчын. Усе яны нашы калгасніцы, мае падругі.

Участак па ільну ўзялі 5 гектараў. Трэба сказаць, што нашы раённыя аграномы, аграномы Райзо і МТС дрэнна дапамагалі нам у рабоце. Некаторыя звенні падабралі не зусім адпаведныя месцы. Так атрымалася і ў нашым звяне. Надышла вясна, трэба пачынаць сеяць, а ў нас участак не падабраны, угнаенні не ведаем якія класці. З дапамогай старэйшых калгаснікаў і адданай работай мы з сваёй задачай справіліся. Узятыя на сябе абавязацельствы выканалі. Узялі абавязацельства сабраць 8 цэнтнераў з гектара, і сабралі. Але гэта не прэдзел. Можна сабраць ураджай значна большы, чым 8 цэнтнераў.

Я яшчэ зусім маладая. Мне толькі што споўнілася 17 год. Ніякай практыкі ў ільнаводстве я не маю. Веды таксама нізкія. Але я маю жаданне да работы і іменна да работы па ільнаводству. Люблю лён. Люблю даглядаць яго, расціць. І вось дзякуючы гэтаму я ў 1937 годзе са

Стаханаўка ільнаводства тав. Шанціла

сваім звяном дабілася такіх паказчыкаў работы.

У новым 1938 годзе абавязваюся дабіцца са свайго паказальнага ўчастка з кожнага гектара па 10 цэнтнераў ільнавалакна, прычым не 16—17 нумарам, як ў гэтым годзе, а 20—22.

Ніна Валентовіч

Калгас імя Леніна, Волкаўскага сельсовета, Талочынскага раёна.

Буду працаваць яшчэ лепш і лепш

Тры гады таму назад сход нашага калгаса вызначыў мяне адказнай па ільну. Тады мне здавалася, што я не спраўлюся з работай. Але я цвёрда рашыла сур'ёзна ўзяцца за справу.

Я праглядзела ўсю калгасную бібліятэку ў пошуках літаратуры аб ільнаводстве. Многа раілася са старымі калгасніцамі-ільнаводкамі. Многа цікавага я даведалася ад іх. Атрымала і парады аграномаў. Набытыя веды, свой практычны вопыт я і прымяніла на калгасным полі.

Работы было многа. Вазьму к прыкладу гэты год. Ранняй вясной, яшчэ перад ворывам, наша ільнаводчае звяно ўгноіла глебу пад лён фекаліем. Пасля ворыва рассеялі фасфарытную муку. Пасеялі лён.

Я проста не магла налюбавацца густымі дружнымі ўсходамі ільну. За 15 дзён перад праполкай і пасля ўгнойвалі курыным памётам, чылійскай салітрай.

Прапалолі тры разы. Пустазелле выносілі з поля і спальвалі. Бывала працуем мы на сваім участку і зацягнем песеньку, больш за ўсё спявалі пра лён, што Янка Купала склаў. Вельмі спадабаліся нам словы:

Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты.

Так хораша складзены, нібы пра наш лён.

Падыйдуць да нас калгаснікі, любуюцца, як мы старанна працуем, асабліва дзед Архіп. Хаця ён высокі, але-ж толькі яго галава відаць з-за сцяблоў ільну, бо лён вышэй метра ростам быў. Усміхаецца дзед Архіп і кажа:

— Эх, і лён,—цацка. Каб хто сказаў раней, што на гэтай зямлі будзе расці такі лён, не паверыў-бы.

Надышла восень. А для мяне гэта восень залатая была. Звозім лён з поля і на калёсы насцілаем пасцілкі, каб па дарозе не высыпаліся зярняткі з галовак. А калі абмалацілі ўвесь лён, паклікаў мяне рахункавод ды і гаворыць:

— Ведаеш, Мар'я Грыгор'еўна, колькі цэнтнераў ільнанасення з гектара атрымалі?

— Ці ёсць 9 цэнтнераў?—спытала я. А сама хвалююся.

— Абавязацельства не толькі выканана, але і перавыканала,— і ён падаў мне паперку, у якой было ўказана, што адзін гектар ільну даў 9 цэнтнераў і 80 кілограм ільнанасення.

З дзяржавай разлічыліся яшчэ да Кастрычніцкіх свят. Здана 135 цэнтнераў ільнанасення, што складае 165 процантаў выканання дзяржаўнага плана. Трасты здана 319 цэнтнераў пры плане 193 цэнтнеры.

З рублі грошай прылічваецца на 1 працадзень у гэтым годзе.

Я бязмежна рада, што за добры лён калгас атрымаў даходу 52 тысячы рублёў.

Мы ўжо даўно рыхтуемся да сяўбы 1938 г. На агульным сходзе калгаснікаў я ўзяла абавязацельства у 1938 г. сабраць 12 цэнтнераў. Наш калгас вырашчвае гатунковае насенне ільну. Цяпер я не думаю, як раней: ці спраўлюся з сваёй работай. Зараз я ўпэўнена, што спраўлюся. Зараз я маю вопыт, набыла веды.

Маю работу адзначыў НКЗ БССР. Па загаду Наркома Земляробства БССР я прэміравана швейнай машынай.

У 1938 годзе буду працаваць яшчэ лепш, каб у будучым годзе атрымаць яшчэ вышэйшы ўраджай ільну.

Мар'я Салаўёва.

Калгас „12 З'езда КП(б)Б",
Талочынскі раён.



Азербайджанская Комуністычная сельскагаспадарчая школа ў студзені выпускае чарговую групу слухачоў у колькасці 120 чалавек.
НА ЗДЫМКУ: выпускніца комсамолка Мамедова Гехар у жывёлагадоўчым кабінеце. **Фото Шыўцова. Саюзфото.**

НАМ ПІШУЦЬ

АБ ЧЫМ РАНЕЙ І МАРЫЦЬ НЕ МАГЛА

Марфу Шыла заўсёды можна бачыць вясёлай і жыццерадаснай, не гледзячы на яе ўзрост. Яна прайшла цяжкі шлях жыцця. Але гэта яе зараз не старыць. Яе часта можна бачыць расказваючай моладзі пра мінулае. Мы таксама папрасілі Марфу расказаць нам аб мінулым і як праходзілі выбары раней. Яна некаторы час маўчала, потым нахмурылася і пачала гаварыць:

— Цяжка было жыць раней. Штодзённыя клопаты аб чорствым кавалку хлеба рабілі наша жыццё беспрасветным. Мне да рэволюцыі было 30 год. Гады былі яшчэ маладыя, але-ж гора тады сагнула мяне і састарыла.

Мы, беднякі, раней не выбіралі, а калі і ўдзельнічалі ў выбарах валаснога старшыні, то мужыкоў нашых спайвалі гарэлкай, а потым багацеі выбіралі каго ім патрэбна было. І абранымі аказваліся заўсёды кулакі. Нас, жанчын, не дапускалі да выбараў. Мы былі пазбаўлены права голасу.

Я да рэволюцыі ні разу не выбірала і марыць аб гэтым не магла.

Зусім непазнавальным жыццё маё стала пры совецкай уладзе. Жыву я зараз і не адчуваю сваіх пяцьдзесят год. Дзяцей у мяне сямёра. Адзін будзе хутка камандзірам, другі—працуе бухгалтарам, чацвёра ходзіць у школу. Жывем мы заможна, усяго ў нас хапае. Сама я ўжо некалькі год працую на жывёлагадоўчай ферме.

Весела і шчасліва жывецца ў эпоху Сталінскай Канстытуцыі. Гэтае вясёлае жыццё даў нам наш родны бацька таварыш Сталін.

12 снежня я прымала ўдзел у выбарах у Вярхоўны Совет. Свой голас я аддала за лепшых людзей нашай радзімы.

Потым яна расказала пра заможнасць калгаснікаў, сваю, пра багаты ўраджай, які сабраў калгас у гэтым годзе, і пра планы на будучае.

Крупкі, калгас „Новая Нача".

А. Дзімітраў.

Рагачоўская школа трактарыстаў-механікаў рыхтуе новыя кадры да веснавой пасеўнай кампаніі. На здымку: брыгадзір-стахановец Віцебскай МТС т. Гатаўскі тлумачыць практыкантцы школы механікаў т. Я. К. Гаршковай, як збіраць матор трактара ХТЗ.

Фота Лупейка (БСФ).

ВАРОЖЫ УЧЫНАК

Караючая рука пролетарскай дыктатуры — слаўныя органы НКВД рашуча змятаюць з твару совецкай зямлі ўсіх і ўсякіх ворагаў народа. Трацкісцка-зіноўеўска-бухарынскае ахвосце ў сваёй апошняй гібелі прыбягае да самых подлых метадаў барацьбы супроць Совецкай улады. Яны, карыстаючыся палітычнай слепатой асобых кіраўнікоў калгасаў, заводаў, там-сям пасягаюць на свяшчэнную соцыялістычную ўласнасць шчаслівага совецкага народа.

Так, у калгасе імя Жданава, Акалоўскага сельсовета, ад варожай рукі 24 снежня згарэў мяльна-трапальны пункт і больш цэнтнера добрага ільнавалакна. Гэты варожы ўчынак зроблен быўшай кулачкай—Малчан Ольгай, якая ўвесь час дзейнічала „ціхай сапай" і падрывала працдысцыпліну ў калгасе. Па яе агітацыі сістэматычна не выходзяць на работу ўся яе радня і іншыя калгасніцы.

Які-ж вынік зрабіла з гэтага кіраўніцтва калгаса? Ці паслужыла гэта для іх урокам? Нічога падобнага тут не адбылося. Старшыня калгаса палітычны сляпец СІВЕЦ доўгі час не змог распазнаць ваўка ў авечай скуры. Да ворага народа—Малчан Ольгі не прынята ніякіх мер. СІВЕЦ у гэтым напрамку праявіў гнілы лібералізм, ён справу перадаў следчым органам і сваю „місію" палічыў скончанай, замест таго, каб мабілізаваць калгаснікаў на выкрыццё да канца варожых элементаў, прытаіўшыхся ў калгасе.

Міх. Рашчынскі.

Плешчаніцкі раён.

РАДАСНАЕ ЖЫЦЦЁ

Калгасніца калгаса імя Блюхера, Варашылаўскага сельсовета, Бабруйскага раёна, Парахневіч Ксеня атрымала дзяржаўную дапамогу на выхананне дзяцей 2000 рублёў. Яна-ж з'яўляецца стаханаўкай нашых соцыялістычных палёў.

— Я, кажа т. Парахневіч,— жыла пры царскім самадзяржаўі вельмі дрэнна, але цяпер толькі дзякуючы Совецкай ўладзе я жыву заможна. На працадні я атрымала 90 пудоў збожжа, 300 пудоў бульбы, 80 пудоў гародніны. Я выпрацавала 750 працадзён. Яшчэ атрымаю—гэта самае менш 50 пудоў збожжа і 200 пудов бульбы.

— Сёлета я сапраўды заможная,—кажа т. Парахневіч,—ёсць і чым пахваліцца. А пры цары я ніколі з сям'ёй не ела хлеба ўволю.

К. Купрыянчык.

РАК МАТКІ

Нярэдка на жаночых полавых органах з'яўляюцца пухліны. Калі пухліна расце марудна, не вельмі атручвае жаночы арганізм і не моцна парушае яго нармальнае жыццё, яе называюць добраякаснай. Злоякасная-ж пухліна шпаркa расце, моцна парушае той орган, на якім яна знаходзіцца і заясільвае ўвесь жаночы арганізм. З ліку злоякасных пухлін часцей за ўсё сустракаецца рак.

Рак можа расці на любым органе жаночай полавай сістэмы. Бывае рак яечніка, рак влагалішча, рак знешніх полавых часцей, але часцей за ўсё бывае рак маткі.

Знешнія праявы рака маткі спачатку невялікія і не вельмі характэрныя. З'яўляюцца белі, часта з нязначнай прымессю крыві. Менструацыі робяцца абільнымі або з'яўляюцца крывянцячэнні, не звязаныя з імі па часу. Калі хвароба ўжо ў разгары, з'яўляецца агульнае недамаганне і слабасць. Жанчына худзее, траціць апетыт і дрэнна спіць. Унізе жывата з'яўляюцца болі, якія часамі робяцца нязноснымі. Да гэтага часу рак часта захапляе суседнія органы, напрыклад мачавы пузыр, і пагэтаму з'яўляюцца розныя няправільнасці ў мочавыпусканні.

Прычыны рака навуцы пакуль Мяркуюць, што ён адбываецца ў мясцах, якія падвяргаюцца частым раздражненням. Некаторыя вучоныя звярталі ўвагу на тое, што аборт таксама з'яўляецца сільным раздражненнем маткі, з якой прычыны ён можа з'явіцца прычынай рака. Другія вучоныя лічаць, што рак адбываецца таксама, як і некаторыя заразныя хваробы,— ад мікробаў.

Галоўным сродкам у барацьбе з гэтай хваробай з'яўляецца ранняе распазнаванне яе і правільнае лячэнне.

Рак маткі часцей за ўсё паражае жанчын пасля 45—50 год, г. зн. у той час, калі ў жанчыны пачынаецца так званы клімактэрычны перыяд. А з прычыны таго, што ў гэты перыяд месячныя пачынаюць з'яўляцца няправільна, дык жанчына пазбаўлена магчымасці, сочачы за імі, выясніць, ці няма ў іх прызнакаў рака. А таму абавязковай умовай для ранняга распазнавання рака для жанчын 45—50 год з'яўляецца абавязковае наведванне ўрача не радзей двух разоў у год. Але рак таксама сустракаецца і ў маладзейшых жанчын. Значыць, яны таксама пры малейшых ненармальнасцях (паяўленне белей, няправільнасці ў менструацыі) неадкладна павінны звярнуцца да ўрача.

Часамі ўрач пры адным агляндзе не можа рашыць, ці ёсць гэта ракавае захворванне. У такіх выпадках захварэўшую жанчыну накіроўваюць у больніцу, дзе для дэталёвага распазнавання хваробы робяць выскабліванне маткі, або выразаюць маленькі кавалачак захварэўшага органа. Даследванне гэтага кавалачка пад мікраскопам дазваляе дэталёва ўстанавіць хваробу.

Як толькі высветлена, што жанчына захварэла ракам, неадкладна пачынаецца лячэнне. Часцей за ўсё ў такіх выпадках робіцца аперацыя, пры якой выдаляецца захварэўшы орган. А для таго, каб знішчыць некаторыя невялікія астаткі рака, якія незаўсёды цалкам удаляюцца, пасля аперацыі жанчыну часамі пачынаюць лячыць рэнтгенаўскімі праменнямі. У другіх выпадках аперацыю зусім не робяць, а адразу прымяняюць рэнтгенаўскія прамяні. У нядаўні час рак пачалі лячыць радыем. Гэтае вешчаство ўкладваецца ў захварэўшыя часці полавых органаў, трымаецца там кароткі час, а затым выімаецца з тым, каб праз некалькі дзён паўтарыць гэтае лячэнне.

Рак—сур'ёзная хвароба. Адзіны правільны шлях барацьбы з ім—гэта ранняе лячэнне.

Доктар Н. М. НІКІЦІН.

НА ЗДЫМКУ: Жаночая хакейная каманда таварыства „Спартак" на трэніроўцы. Фота Лейна.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

ЦАНА 20 кап.

Да гэтага нумара дадаецца ўкладка—выкрайка.

910



НАРКАМХАРЧПРОМ СССР

ГАЛОЎЛАРФУМЕР

АРХІЎ ДРУКУ БССР 938

КРЭМ

„Оникс"

(На ноч)

Вельмі добры сродак для змякчэння скуры твара і рук.

КРЭМ

„ФЛОРА"

(Дзённы)

Для сухой і тлустай скуры. Твар робіцца мяккім і набывае прыемную свежасць

ПАТРАБУЙЦЕ ЎСЮДЫ!

Выпуск